**Сцепанцоў А.І.,** *начальнік аддзела навучальных устаноў і кадраў Міністэрства культуры РБ*

# АДУКАЦЫЯ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ І САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ КАНТЭКСТ

У сферы культуры нашай краіны шмат праблем. Назавем толькі некаторыя з іх:

- незапатрабаванасць грамадствам дыпламаваных маладых спецыялістаў;
- нізкі ўзровень НТР;
- адсутнасць пераемнасці паміж пачатковай, сярэдняй ступенямі адукацыі і вышэйшай, што прымушае на вышэйшай ступені часта выконваць задачы папярэдніх;
- адсутнасць належнага ўзроўню спалучэння традыцый і наватарства: як захаваць і развіць усё лепшае, што існуе здаўна, ацаніць, далучыць і ўкараніць новае;
- уплыў палітычнай кан'юнктуры на развіццё сістэмы адукацыі ў сферы культуры і інш.

Вырашаючы гэтыя і іншыя праблемы, мы адначасова можам гаварыць і аб пэўных пазітыўных тэндэнцыях сярод іх:

- функцыянаванне разгорнутай сеткі ўстаноў культуры, наяўнасць матэрыяльна-тэхнічнай базы (пакуль яшчэ прыгоднай для эксплуатацыі) і нават пашырэнне музейнай сеткі;
- абнаўленне зместу культурна-асветніцкай работы, прыняцце ўрадавай праграмы падрымкі традыцыйнай культуры;
- прыняцце шэрага важных заканадаўчых актаў у галіне культуры;
- пашырэнне міжнародных кантактаў з краінамі СНД і Еўропы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- правядзенне фестываляў, конкурсаў, аглядаў, выстаў, пленэраў практычна ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі;

- наяўнасць змястоўнай афішы тэатраў і канцэртных арганізацый;

- сусветнае прызнанне беларускай балетнай школы, захаванне традыцый прафесіяналізму ў многіх відах мастацтва, узнікненне новых тэндэнцый у развіцці тэатра, жывапісу, іншых відах мастацтва, актыўная падтрымка дзяржавай творча адоранай моладзі і, як вынік, значны рост колькасці лаўрэатаў міжнародных конкурсаў, фестываляў;

- захаванне навукова-творчага патэнцыялу навучальных устаноў галіны, павелічэнне кантынгенту дзіцячых школ мастацтваў усіх тыпаў;

- актывізацыя дзейнасці культурных суполак нацыянальных меншасцей;

- павышэнне ставак аўтарскага ганарару, павелічэнне сродкаў на закуп твораў мастацтва;

- паступовае фарміраванне рынку платных культурных паслуг.

Усё гэта дае падставу для аптымістычнага погляду на агульныя тэндэнцыі развіцця галіны культуры. Аднак асаблівасці эканамічнага стану рэспублікі патрабуюць увагі да становішча спраў у культуры ў сувязі з праявай шэрага негатыўных тэндэнцый, якія здольны не толькі істотна замарудзіць тэмпы культурнага будаўніцтва, але і прывесці да незваротных страт у сферы культуры.

Выдатны філосаф-класік нашага часу Аляксей Фёдаравіч Лосеў даў азначэнне культуры як «найбольшай агульнасці ўсіх асноўных слаёў гістарычнага працэсу (эканамічных, сацыяльна-палітычных, ідэалагічных, практычна-тэхнічных, рамёсных, навуковых, бытавых)".

А вось азначэнне англійскага культуролага Скратона: «Культура — уся чалавечая дзейнасць, якая напаўняе сусвет

значэннем і складае аснову ўсведамлення індывідам яго сацыяльнай прыроды».

З гэтых азначэнняў, прынятых намі, вынікае, што культуралагічная адукацыя — звяно культуры, неад'емная яе частка ў канкрэтна-гістарычнай сацыяльна-культурнай сістэме.

Адукацыя — гэта кругаварот грамадска-культуралагічнага працэсу, у які «ўліваецца» будучы суб'ект адукацыі. Ён праходзіць праз фільтры адукацыйнай сістэмы, падпітваецца адукацыйнымі акумулятарамі і, нарэшце, «выліваецца» праз плаціну адукацыі ў адкрытую сістэму грамадства.

Што ж уяўляе сабою сістэма адукацыі ў галіне культуры нашай рэспублікі?

Перш за ўсё адукацыя ў сферы культуры ў Беларусі мае свае глыбокія гістарычныя карані і пэўныя традыцыі.

Пачынаючы з XVII стагоддзя, на нашай тэрыторыі вядомы так званыя музычныя бурсы, у якіх прафесію музыканта атрымоўвалі дзеці з бедных сем'яў. Пры культавых цэнтрах былі не толькі спецыяльныя музычныя, але і агульнаадукацыйныя ўстановы, дзе выкладалася музыка (у праваслаўных — семінарыі, у каталіцкіх — калегіумы). Там вучыліся пераважна дзеці дваран і замежных гараджан. З XVIII стагоддзя ў такіх гарадах, як Нясвіж, Слуцк, Гародня, Слонім, Шклоў, Ружаны, існавалі музычна-асветніцкія цэнтры, якія аб'ядноўвалі оперна-балетныя тэатры, аркестры-капэлы, музычна-тэатральныя школы.

Даволі інтэнсіўна пачалі развівацца свецкія формы выхавання пасля 1773г. у сувязі з заснаваннем Адукацыйнай камісіі. Пад яе ўплывам у беларускіх гарадах адкрываліся шматлікія прыватныя школы і пансіёны з выкладаннем музычных прадметаў.

У настаўніцкіх семінарыях Беларусі ажыццяўлялася абавязкова музычна-педагагічная падрыхтоўка настаўнікаў народных вучылішчаў. Кожны з настаўнікаў авалодваў спецыяльнай



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

методыкай па развіццю творчасці і эстэтычных пачаткаў ў вучня. Праводзіліся з'езды выкладчыкаў (напрыклад, графічных мастацтваў і рамёстваў). У школах і вучылішчах ствараліся аркестры. Так, у 1830-1840 гадах шырокай папулярнасцю карыстаўся аркестр Гомельскай музычнай школы. Пазней, у 1872 г., вядомасць набыло Мінскае вучылішча арганістаў.

У беларускіх гарадах XVII стагоддзя менавіта музычная адукацыя і выхаванне атрымалі пераважнае развіццё і ажыццяўляліся ў розных навучальных установах, ахоплівалі многія сацыяльныя групы, мелі разнастайныя формы. Гэта дазваляла рыхтаваць як прафесіяналаў, так і дасведчаных у мастацтве аматараў, спрыяла захоўванню і развіццю традыцый у мастацтве, станаўленню мясцовага прафесійнага і аматарскага мастацтва.

У памятнай кніжцы Віленскай вучэбнай акругі за 1913 год давалася характарыстыка навучальных устаноў усіх губерняў, у якіх існавала спецыяльная сістэма падтрымкі таленавітых дзяцей пры дапамозе стыпендый і ўзнагарод. Рэгулярна (як правіла, некалькі разоў на год) праводзіліся выставы работ навучэнцаў, у тым ліку па маляванню, дэкаратыўна-прыкладному мастацтву. Пераможцы атрымлівалі ўзнагароды.

Шырокую вядомасць набыла прыватная Віцебская мастацкая школа Пэна, якая праіснавала з 1898 г. па 1918 г.

Усе навучальныя ўстановы таго часу былі прыватнымі, але іх ўплыў і выніковасць аказаліся даволі істотнымі, што дазволіла ў будучым стварыць устойлівую і эфектыўную сістэму адукацыі ў сферы культуры.

Першымі дзяржаўнымі навучальнымі ўстановамі былі музычныя вучылішчы. Ужо ў 1918 г. у Віцебску была адкрыта народная кансерваторыя — па сутнасці, сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова, эстафету ад якой у 1924 г. падхапіла Віцебскае музычнае вучылішча. У 1925 г. адкрываецца Мінскае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычнае вучылішча, значэнне якога асаблівае, бо на яго аснове была створана Беларуская дзяржаўная кансерваторыя.

Такога тыпу прафесійныя навучальныя ўстановы з'яўляюцца асновай сістэмы адукацыі. У рэспубліцы іх дваццаць. У іх рыхтуюцца спецыялісты сярэдняй спецыяльнай кваліфікацыі па ўсіх напрамках культуры. Гэта мастакі-афарміцелі, выкладчыкі малявання, музыкі, харэаграфіі, канцэртмайстры, бібліятэкары, арганізатары самадзейнай клубнай работы, кіраўнікі шматлікіх гурткоў — усяго 48 спецыяльнасцей і спецыялізацый. У сярэдніх спецыяльных установах працуюць звыш 2000 выкладчыкаў, з якіх 92% з вышэйшай адукацыяй. Гэтыя навучальныя ўстановы таксама з'яўляюцца асноўнымі «пастаўшчыкамі» абітурыентаў для ВНУ культуры.

Навучальнымі ўстановамі сярэдняга звяна рэспубліка ахоплена раўнамерна: кожная вобласць (акрамя Магілёўскай) мае па два музычных вучылішчы, усе вобласці маюць па аднаму вучылішчу мастацтваў, дзе рыхтуюцца спецыялісты ўсіх напрамкаў культуры.

Гаворачы пра навучальныя ўстановы гэтага тыпу, асабліва хочацца падкрэсліць іх важную ролю ў станаўленні і развіцці рэгіянальных культурных працэсаў. Па сутнасці гэта цэнтры актыўнай культурнай асветы. У апошнія пяць гадоў адбыліся такія прыметныя падзеі, як фестываль імя музычнага крытыка Салярцінскага ў Віцебску, фестываль «Музыка надзеі» ў Гомелі, «Калядныя сустрэчы» ў Брэсце. Практычна кожнай сярэдняй спецыяльнай навучальнай установай пракладзены трывалыя міжнародныя маршруты.

Падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для мастацтва пачалася ў кастрычніку 1932 года, калі была адкрыта Беларуская дзяржаўная кансерваторыя. У той час залічылі 40 студэнтаў, большасць з якіх былі выпускнікамі Мінскага музычнага тэхнікума.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1945 годзе адкрыты тэатральны інстытут, які ў 1949 годзе даў першы выпуск акцёраў драмтэатра. У 1953 годзе ствараецца мастацкі факультэт з аддзяленнямі жывапісу, скульптуры, графікі. З 1991 года гэты інстытут стаў Беларускай акадэміяй мастацтваў.

У кастрычніку 1975 года ствараецца Мінскі інстытут культуры, цяпер універсітэт.

Дарэчы, на гэтую ўстанову асабліва спадзяецца рэспубліка, бо менавіта універсітэт культуры актыўна і плённа адгукнуўся на дзяржаўную неабходнасць разгортвання падрыхтоўкі ўсёй наменклатуры спецыяльнасцей культуры ў рэспубліцы.

Структура вышэйшай адукацыі пастаянна ўдасканальваецца: пачалася падрыхтоўка спецыялістаў для тэлебачання ў акадэміі мастацтваў, уведзены спецыяльнасці «менеджмент сацыякультурнай дзейнасці», «педагогіка сацыякультурнай дзейнасці», «мастацтва эстрады», «літаратурная работа» ва універсітэце культуры і інш.

Разгорнута падрыхтоўка аспірантаў і асістэнтаў-стажораў па тэатральным, музычным, выяўленчым мастацтве, тэорыі і гісторыі культуры, тэорыі, методыцы і арганізацыі культасветдзейнасці, бібліятэказнаўству і бібліяграфазнаўству.

У вышэйшых навучальных установах працуюць асноўныя навукова-педагагічныя сілы сферы культуры — 556 выкладчыкаў, сярод якіх 15 дактароў навук, 45 прафесараў, 149 кандыдатаў навук, 188 дацэнтаў. Сярод выкладчыкаў 20 народных, 17 заслужаных артыстаў, 29 заслужаных дзеячаў мастацтваў і культуры, 5 заслужаных работнікаў вышэйшай школы.

За апошнія гады ўдалося не толькі поўнасцю захаваць навукова-творчы патэнцыял вышэйшых навучальных устаноў, але і больш эфектыўна выкарыстоўваць іх магчымасці па забеспячэнню патрэбнасцей устаноў культуры.

Удакладнены патрэбнасці рэгіёнаў у спецыялістах, павы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шаны патрабаванні да якасці прыёму студэнтаў. Шырока практыкуецца мэтавая падрыхтоўка кадраў па заяўках абласцей (у першую чаргу для сельскай мясцовасці). У мінулым годзе адноўлена завочная форма навучання у акадэміі музыкі. Зараз яна ажыццяўляецца толькі па мэтавых накіраваннях для тых, хто працуе ва ўстановах культуры па адпаведных спецыяльнасцях.

Прыём у ВНУ мінулага года засведчыў павышэнне цікавасці моладзі да прафесій галіны культуры. Ужо склаўся ўстойліва вялікі конкурс ва універсітэт культуры: у сярэднім каля чатырох чалавек на месца, а па асобных спецыяльнасцях — да сямі чалавек на месца.

Тры чалавекі на месца было ў акадэміі мастацтваў, звыш двух чалавек — у акадэміі музыкі.

ВНУ культуры знаходзяцца ў сталіцы, і натуральна, што большая частка кантынгенту — гэта мінчане. Па-ранейшаму захоўваецца разрыў у падрыхтаванасці абітурыентаў, перыферыя ўсё яшчэ прайграе мінчанам. Аднак метадычная дапамога абласным вучылішчам культуры, кансультацыі іх выпускнікоў дазволілі палепшыць сітуацыю. У параўнанні з 1995 годам стала больш іншагародніх (ва універсітэце культуры — на 17%, у акадэміі музыкі — на 15%, у акадэміі мастацтваў — на 16%).

ВНУ культуры з'яўляюцца буйнымі асветніцкімі цэнтрамі, якія ажыццяўляюць шырокую канцэртна-відовішчную дзейнасць. Гэта не толькі істотная частка фарміравання спецыяліста, але і жыццёвая патрэбнасць у самавызначэнні кожнага студэнта і яго педагога. Усе тры ВНУ маюць значныя дасягненні ў адпаведным напрамку культуры. Публічнасць вынікаў навучання — галоўная асаблівасць адукацыі ў сферы культуры.

Апошнія пяць гадоў дзейнасць нашых ВНУ адзначана актыўным наладжваннем міжнароднага супрацоўніцтва. Гэта асабліва важна, таму што нашы ВНУ з'яўляюцца своеасаблівымі манапалістамі па сваіх спецыяльнасцях, і менавіта праз міжнародныя сувязі існуе магчымасць не толькі параўнання і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ацэнкі якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, але і творчага іх ўзбагачэння.

У рэспубліцы склалася ўстойлівая сістэма дзяржаўнай адукацыі ў галіне культуры. Сістэма мае тры ўзроўні. Вышэйшы — гэта ВНУ, сярэдні — сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, пачатковы — дзіцячыя школы мастацтваў. Сістэма мае трывалыя ўзаемасувязі, і развіццё кожнай яе часткі служыць канчатковай мэце адукацыі ў сферы культуры — выхаванню прафесіяналаў для мастацкай творчасці.

Пачатковае звяно — 534 дзіцячыя школы мастацтваў з кантынгентам 84 тысячы дзяцей. Рэальныя функцыі гэтых навучальных устаноў — дапамагчы навучэнцам набыць прафесійныя навыкі, выявіць меру здольнасцей, зрабіць выбар прафесіі і, галоўнае, навучыць успрымаць мастацтва. Выпускнікі такой школы — ці патэнцыяльныя прафесіяналы, ці адукаваныя аматары, якія павінны быць носьбітамі комплексу духоўна-культурных патрэбнасцей і знаходзіць шляхі іх рэалізацыі.

Статыстыка сведчыць, што 80% выпускнікоў ВНУ культуры закончылі ў свой час дзіцячую школу мастацтваў; для акадэміі музыкі такі паказчык — 95%.

Сістэма дзяржаўнай адукацыі ў галіне культуры вытрымала выпрабаванне часу і дэманструе жыццяздольнасць у складаных умовах цяперашняга жыцця. Яе здабыткі відавочныя, і асноўная задача — зберагчы і забяспечыць прыярытэтную падтрымку не толькі дзяржавы, але і з боку ўсяго грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ